# Нашы юбіляры

## БРАНІСЛАЎ АЛЯКСАНДРАВІЧ ПЛОТНІКАЎ



Споўнілася пяцьдзесят гадоў доктару філалагічных навук прафесару кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна Браніславу Аляксандравічу Плотнікаву.

Б. А. Плотнікаў нарадзіўся 15 снежня 1940 года ў горадзе Быхаве Магілёўскай вобласці ў сям'і рабочых. Яго дзяцінства і юнацтва былі нялёгкімі: ў 1944 годзе загінуў на фронце бацька, а праз год памерла маці. Застаўшыся сіратой, ён выхоўваўся ў Грудзінаўскім дзіцячым доме, што на Быхаўшчыне. Пасля 9-га класа вучыўся ў рамесным вучылішчы № 12 горада Асбеста Свярдлоўскай вобласці. Скончыўшы яго, працаваў там, з перапынкам на службу ў Савецкай Арміі, машыністам электравоза і працягваў вучобу ў вячэрняй школе. У 1964 годзе, атрымаўшы атэстат сталасці, паступіў на філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Ужо студэнтам, займаючыся ў лінгвістычных семінарах, выявіў вялікія даследчыя здольнасці па мове. Вось чаму пасля заканчэння універсітэта (а скончыў яго на «выдатна») быў рэкамендаваны ў аспірантуру па кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства. У 1971 годзе датэрмінова абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Дыстрыбутыўна-статыстычны аналіз адной лексічнай групы (словы са значэннем «справа, работа» у рускай мове)» і працаваў на гэтай кафедры выкладчыкам, старшым выкладчыкам, потым дацэнтам. У 1981 годзе абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Даследаванне лексічнага значэння шляхам квантытатыўнага аналізу дыстрыбутыўных уласцівасцей слова», праз два гады быў зацверджаны ў званні прафесара.

Галоўным аб'ектам навуковых заняткаў Б. А. Плотнікава з'яўляецца агульнае мовазнаўства. Розным праблемам семантыкі натуральных моў ён прысвяціў тры кнігі. Вялікую цікавасць у спецыялістаў выклікала ўжо першая яго кніга «Дистрибутивно-статистический анализ лексических значений» (1979), у якой разгледжаны сучасныя прыёмы вывучэння лексічнай семантыкі наогул і асабліва пытанняў сінаніміі, антаніміі, полісеміі з прымяненнем дакладных матэматычна-статыстычных метадаў. У кнізе «Основы семасиологии» (1984) прааналізаваны галоўныя канцэпцыі і аспекты значэння, выяўлены асаблівасці семантыкі розных адзінак мовы, раскрыта прырода такіх семантычных з'яў, як полісемія, аманімія, унутраная форма слова, апісаны найбольш прымяняльныя метады даследавання моўнай семантыкі. Навізной і арыгінальнасцю вызначаецца і кніга «О форме и содержании в языке» (1989), у якой упершыню ў айчыннай мовазнаўчай навуцы ўсебакова асветлены пытанні суадносін моўнай формы і зместу на фанетычным, графічным і граматычным узроўнях мовы, праблемы эвалюцыі гэтых суадносін у розных моўных адзінках.

Б. А. Плотнікаў з'яўляецца аўтарам вучэбнага дапаможніка для філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў «Общее языкознание. Семинарий» (1986), сааўтарам такіх вучэбных дапаможнікаў і навуковых манаграфій, як «Введение в специальность» (1977), «Общее языкознание» (1983), «Чешский язык» (1985), «Русско-чешский и чешско-русский словарь общегеографических терминов» (1985), «Дихотомическая лексикология» (1989).

У полі зроку навуковых інтарэсаў Б. А. Плотнікава ўвесь час знаходзіцца таксама беларуская мова і яе суадносіны з іншымі славянскімі мовамі. Па розных

аспектах гэтай тэмы ён змясціў у савецкім і замежным друку шэраг змястоўных артыкулаў: «Статыстычныя даследаванні мовы ў Беларусі» (1975), «Сопоставительный анализ однозначных текстов русского и белорусского языков» (1976), «Однокоренная лексика болгарского и белорусского языков» (1976), «Колькасны аналіз некаторых прыметнікаў у паэмах Я. Купалы і Я. Коласа» (1982), «О соотношении рода существительных в белорусском и чешском языках» (1983), «Названия продуктов питания в белорусском и болгарском языках» (1986), «Дыхатамічная класіфікацыя варыянтных слоў у тэрміналогіі беларускага народнага ткацтва» (1988) і іншыя.

З навуковымі дакладамі і паведамленнямі па розных праблемах агульнага і славянскага мовазнаўства юбіляр выступаў на многіх навуковых канферэнцыях і сімпозіумах у нашай краіне і за мяжой.

Плённа займаючыся вучэбнай і даследчай працай, Б. А. Плотнікаў пастаянна клапоціцца аб падрыхтоўцы навуковых кадраў. Шэсць яго савецкіх і замежных аспірантаў ужо паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі, яшчэ чатыры завяршаюць работу над імі. Сам ён часта выступае афіцыйным апанентам пры абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

Цяпер Б. А. Плотнікаў у росквіце сваіх творчых сіл. Ён здаў у друк манаграфію «Семиотика текста», завяршае вучэбны дапаможнік для аддзяленняў беларускай мовы і літаратуры філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі «Агульнае мовазнаўства», выношвае новыя навуковыя задумы.

Высокакваліфікаваны вучоны-мовазнавец, выдатны выкладчык, сціплы і добразычлівы чалавек, Браніслаў Аляксандравіч Плотнікаў карыстаецца на факультэце вялікай павагай і любоўю. Калегі, шматлікія вучні і сябры віншуюць яго з юбілеем, жадаюць яму добрага здароўя, далейшых навуковых поспехаў і асабістага шчасця.

**І. К. ГЕРМАНОВІЧ**